# ЧУЖАЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА

**РАМАН**

# I

Быў лістапад, было святога Міхала — блізілася пара зімы, а ў гэты год стаяла цяпло. Павярнуўшыся з полудня, павільгатнеў вецер, памякчэла пад нагамі зямля, і крот стаў тачыць каля пустых, ужо зацягнутых, як раскаю, дробнаю макрыцаю градаў рудаватыя сырыя замежкі. У зацішку за хатамі, каля чорных голых яблыняў, на якіх яшчэ трымаўся дзе збуцвелы, але чырванаваты з аднаго боку яблык, віліся слупом, нейкія большыя ў гэту пару, камары.

Уночы завязваўся туман, асыпаючыся наранкі імжою: на мокрым зеленаватым галлі дрэў дрыжалі і наліваліся, як сляза на вейках, кроплі вады. Сярод дня пазірала белаватае сонца — туман разыходзіўся, падымаючыся жаўтаватымі, як дым ад сырога алешніку, хмарамі. Адкрываўся свет — белаватае, выпаласканае дажджамі ржышча за вёскаю, зялёная рунь на грудку, рудая і пухкая, як выхаджанае цеста, ралля, сівыя абымшэлыя каменні пры чэрствай пясчанай дарозе, што выдавалі здалёк авечкамі.

Праз рэдкае галлё пруткіх дрэў у вёсцы былі відаць каўпакі стрэх з зялёнымі пляйстрамі сырога моху, нечы не дакрыты яшчэ жоўтым, як воск, кулём хлевушок. На прывязаным уздоўж страхі тоўстым руб лі стаяў мужчына, ляпаў шырокаю стрыхалкаю, падбіваючы густую шчотку саломы.

Учуўшы цяпло ў гразкіх, без гною, хлявах, рыкалі каровы, і нехта выпускаў сваю на

зрудзелы прыгумень, каб выветрылася, а потым гнаў вуліцаю да вады, забягаючы наперад, лёгка ляпаў рукою па шыі, заварочваў да рэчкі. З вёскі было відно, як праз голы і карычняваты, нібы дзяркач, алешнік блішчыць настылым холадам вада.

Узяўшы за дзве полкі спадніцу і пераступіўшы калючы дрот, наўпрасты праз садок, дзе між радкоў карчыстых яблынь ляжалі на козлах накрытыя кажухамі яловай кары шарыя калоды вулляў, да рэчкі спускалася кабета з лазовым кошыкам у руцэ, з якога выпіраўся сіняваты авечы трыбух.

У чорным лісці пад вішнямі грабліся і ціўкалі, шукаючы яшчэ квактуху, цыбатыя, бясхвостыя байстручкі-кураняты, што вывеліся пад самую восень, недзе за хатаю, у дзіравым і сівым, нібы абсыпаным попелам, лопуху.

Вуліцаю ехала падвода — па пяску пруткімі вяршкамі шоргаў накіданы на воз малады алешнік. Перакідваючы лейцы і астаючыся ззаду воза, чалавек у суконным паўшубку з рудым цялячым каўняром кіраваў каня на брукаваны надворак — на гладкіх каменнях з грукатам падскоквалі колы.

За рэчкаю смяяліся бабы, варочаючыся з маладога, жаўтлявага пад зіму хвойніку і несучы ў радзюжках кастрыцу — падкінуць на подсціл карове ці высыпаць на прызбу. Іхні тонкі голас і смех былі доўга чуваць, нават яшчэ з надворкаў, калі яны ўвайшлі ў вёску і па адной адлучаліся ад купы, заварочваючы кожная пад сваю хату.

Людзі ўпраўляліся да зімы. Мянялася квадра месяца — чакаліся халады. Трымаючы

пад пахаю ўкручанае ў салявы мяшок шкло, па вёсцы хадзіў шкляр. За ім бегла і гаўкала, трасучы доўгімі вушмі, жоўтая з крываватымі лапамі сучачка. Шкляр ішоў, задраўшы галаў і высока паднімаючы ногі, як ходзяць сляпыя, і не азіраўся. Сучачка мінула колькі хат, пагаўкала, стоячы сярод вуліцы, і, вінавата ўгнуўшы галаў, пабегла назад.

Вёска сцішэла, толькі недзе далекавата, у другім канцы яе, быў чуваць цяжкі, тупаваты грукат цапа. І раптам зноў зайшлася ад брэху і клубком выкацілася на вуліцу аблавухая жоўтая сучачка.

У другой ад канца хаце ўжо ведалі, што ў вёску ідзе нехта чужы — пільная сучачка ніколі не брахала на тутэйшага чалавека.

— І каго ж гэта там нясе? — не вытрывала мажная, сытая, як ялавіца, маладзіца і, стаўшы каленам на лаву, глянула ў запацелае акно.

З белаватае ад перацёртага жвіру шашы, што хавалася ў карычняватай навісі старых, карэлых бярэзін, на пясчаную чэрствую дарогу, у вёску, звярнулі двое мужчын. Адзін у кароткім белым кажусе з нявыдубленых аўчын, у чорнай, як гракавое гняздо, авечай шапцы, другі — у суконным рудым паўшубку. Той, што быў у паўшубку, выдаваў высокім і, як можна было пазнаць па лёгкай хадзе, маладым.

Мужчыны дайшлі да шарага, перакошанага ад старасці крыжа з белым новым ручніком, завязаным каля абразка, і завярнулі да першай, што глядзела на вуліцу адным кутным акном, хаты.

— Да Чадоў пайшлі, — зняла з лавы кален і пакруціла на клубах спадніцу сытая маладзіца.

— Мо швагір з Восава? — аказалася старая, седзячы на палку, што быў замест ложка, і трымаючы растапыранымі пальцамі цяжкі клубок пражы — у кошыку на зямлі круціўся высушаны ў печы і раз'еханы пачынак. Старая намотвала арэхавым юрком на клубок пражу. Каструбаватая нітка суха трашчала ў юрку.

— Чужыя саўсім людзі. — Маладзіца адышлася ад акна і развязала пад барадою белую, у сінія валошкі хустку. — Духата, каб мы не пачадзелі, — і яна пацягнула за адзін ражок хустку, паказаўшы пышныя, пэўна, наранкі вымытыя, цёмна-русявыя валасы, скручаныя на патыліцы ў тоўстую куклу.

У хаце стаяла парная гарачыня — на стале і на лавах астывалі накрытыя чыстымі ручнікамі гарачыя бoханы хлеба. Ад іх пахла гаркаватаю падпаленаю скарынкаю і кляновым лісцем. У хаце, густа запацеўшы, плакалі вокны — яны былі без дубэльтаў. Буйны, серабрысты, як луска, пот збягаўся ў кроплі і сцякаўся па шкле на жаўтаватую нефарбованую шуфляду — на ёй ужо вымаклі чорныя палосы. Праз шырокія вадзяныя рагі на шыбах было відаць, як па частаколе скача не злінялая яшчэ, з нейкім мокрым, як выскубленым, чубком белабокая сарока.

— Навіну ж нейкую прынясла, — сказала старая, ссоўваючы з высокага палка худыя жоўтыя ногі, каб раскруціць сухі асыпаны пачынак.

— Во, да нас ідуць тыя людзі, — пазяхнула маладзіца і зірнула ў люстэрка, убачыла свой ружаваты ад гарачыні твар і асталася давольнаю.

За вокнамі доўгім хвастом мільганула сарока, і на другі бок хаты, зайшоўшыся ад брэху, клубком пакацілася заядлая сучачка. Маладзіца высунула галаву з-за сцяны і ўбачыла за акном тых самых мужчын.

— І што ж гэта за людзі? — сказала яна і адступілася ад акна.

Дзверы знадворку рыпнулі — у сенях затупалі, загаварылі. Кабеты, сцішыўшыся, пільна глядзелі на дзверы. У клямцы падскочыў і дзынкнуў язычок. З цемнаты сяней паказаўся белы кароткі кажух, і ў хату ўсунулася калматая авечая шапка. Услед за старым, прыгінаючыся, каб не зачапіцца галавою за вушак, зайшоў чарнявы, год дваццаці, хлопец з даўгаватымі, пачырванелымі ад холаду рукамі — суконны паўшубак быў яму караткаваты.

— Дзень добры вам, — сказаў старэйшы, расшпільваючы тоўстымі вузлаватымі пальцамі кажух і адкладваючы настаўлены каўнер.

Маладзейшы стаяў за ім, мусіць, саромеючыся, што відаць з рукавоў яго доўгія рукі.

— Дзень добры, — азвалася старая і палажыла на прыпол свой цяжкі клубок.

— Ці патрэбны вам малацьбіты? — глянуўшы спярша на маладзіцу, потым на старую, спытаў мужчына ў белым кажусе.

— Чаму ж, патрэбныя, — сказала маладзіца, падсоўваючы на лаве хлеб. — Садзецеся...

— О, і нагрэцца можна, — памацаў рукою лаву і прысеў на цеплаватае вільготнае месца старэйшы мужчына. — Садзіся, Імполь, за пастой грошы не плоцяць, — ён падсунуўся, даючы сесці хлопцу.

— У нас ужо і мышы добра памалацілі, — ссунулася з ложка старая і, трымаючы на сашчэмленых руках вагкі клубок, панесла яго да печы — там ля коміна сохла яшчэ зеленаватая пража.

— Нічога, і нам хваціць, — сказала маладзіца, падхапіўшы пад пахі два боханы хлеба, памкнулася да дзвярэй, каб, мусіць, палажыць іх у стопцы.

Мужчыны аглядалі чужую хату: яшчэ не пабеленую, з замазанымі глінаю пазамі, дзе выглядаў мох, з новаю, таксама яшчэ не беленаю печчу з сухімі плямамі ніжай пячорак. Хата была без падлогі — на гліняным току было знаць круглыя ўмяціны ад калодкі, якою трамбавалі гліну. Ці ад таго, што хата была новая і пуставатая, яна выглядала прасторнаю. Каля глухое сцяны стаяў драўляны, паточаны шашалем ложак, засланы жоўтаю, у чорныя елачкі радзюжкаю. У яго ўпіраўся шырокі дашчаны палок. Між акон на сцяне, спяшаючыся, цікаў вялікі ў драўлянай аправе гадзіннік — на медным ланцужку вісела алавяная гіра з іржавай (мусіць, для цяжару) шрубкай. З-за абраза на покуці выглядалі жоўтыя чачоткі піжмы і бурачковы таўкачык васількі.

— А хто ж вам нараіў да нас зайсці? — спытала маладзіца, вярнуўшыся ў хату і забіраючы пад пахі яшчэ два боханы хлеба.

— Духам чуем, што ў хаце гаспадара нямашука. — У старога скрывілася губа і стаў відаць чорны, дуплявы зуб. — Хто ж так прыбівае? — паказаў ён на покуць, дзе быў крыва прыбіты трыкутнік палічкі. — Відаць, што бабская работа.

— Гэта ж праўда, — засмяялася маладзіца, прыжмурыўшы адно вока. — Я прыбівала, — прызналася ўжо яна, трымаючы пад пахаю два боханы і папіхваючы локцем непрычыненыя дзверы.

— Мо людзі галодныя? — сказала старая, калі маладзіца вярнулася ў хату.

— Во і праўда, мы сягоння капусты наварылі як на велькую сям'ю. — Яна зіркнула толькі на маладога — ён засаромеўся і замыляў губамі, не ведаючы, што сказаць.

— У такім разе можам памагчы, праўда, Імполь?

— Во, цэлы гаршчок. — Маладзіца падышла да прыпека, адняла засланку і, прыгнуўшыся, паглядзела ў печ. Мужчыны моўчкі глядзелі на яе белыя вышай лытак ногі, бо іх улетку хавала ад сонца нізкая доўгая спадніца.

З прыпека запахла кіслаю капустаю. Малады каўтнуў сліну і зняў шапку — чорныя валасы яго адлівалі сінявою.

— Падсажвайцеся да стала. — Маладзіца паставіла на стол гліняную міску і паклала дзве счарнелыя драўляныя лыжкі.

Мужчыны падняліся з лавы, распрануліся і, склаўшы тут, дзе сядзелі, адна на адну адзежу, зверху яшчэ прытаптаўшы яе шапкамі, падышлі да стала.

Трымаючы анучамі гарачы гаршчок, маладзіца наліла ў гліняную міску капусты: спярша рэдкага шчолаку, проста з гаршка, а потым гушчы, чэрпаючы ўжо лыжкаю.

Стары паднёс расхістаны, з клінкамі ў ножках, заслон, папрабаваўшы, ці будзе стаяць, сеў.

Малады таптаўся зводдаль, усё хаваючы за спіну рукі — у яго паркалёвай рубашцы павылазілі локці.

— Чаго ж стаіце, садзецеся! — Маладзіца вярнулася да прыпека і прынесла тонкі, што ўжо з'еўся, нож.

— Як даюць, то бяры, а як б'юць, то ўцякай, га? — абярнуўся і сказаў за плячо старэйшы мужчына.

— А хто ж яго тут будзе біць? Дый ці дасі такому рады? — зірнула на хлопца і засмяялася, крывячы мяккую, з залацістым пушком губу, сытая маладзіца.

— Можна, толькі дзе ўзяцца, — махнуў натапыраным чубком валасоў стары лысаваты малацьбіт.

Малады, чырванеючы і не паднімаючы вачэй, ціха прымасціўся на заслоне.

Мужчыны, сцішыўшыся і моцна сёрбаючы, пачалі есці. Маладзіца бачыла, як у Імполя варушыліся сківіцы. Яна глядзела на яго гладкі карак, на закручаныя ў лагчынцы валасы, на яго шырокія плечы, на якіх не сыходзілася тонкая паркалёвая рубашка, і падумала, што вот добра, што ён наняўся малаціць, і нават убачыла, здалося ёй, як ён сціснуў бы яе гэтымі дужымі рукамі і яна не вырвалася б.

На надворку затупалі ногі, і за вокнамі мільганула шарая суконная хустка.

— Во, мусіць, наша кудзельніца ідзе? — сказала старая, атрасаючы з прыполу кастрыцу, што нацерушылася з пражы.

Адчыніўшы дзверы і выставіўшы наперад прасніцу з барадою недапрадзенае кудзелі, у хату ўвайшла кабета ў шарачковым, завужаным у таліі сачыку. З-пад суконнай хусткі выбіваўся пучок русявых валасоў з белаватаю сіваю пасмаю. На шчаку, недзе з-за вуха, лезла лілова-пякучая чырвань — радзімы знак. Жанчына, прыжмурваючы адно вока і перакошваючы разяўлены рот, пільна ўзіралася на чужых.

Яны, перастаўшы жаваць, азірнуліся.

— Во, малаціць будуць, — маладзіца сагнула ў локцях абедзве рукі і памахала імі, паказваючы, як малоцяць.

— Ы-ы-ы, — паставіўшы на ложак прасніцу, заківала галавою кабета, і яе сіні, скамянелы ад холаду твар памякчэў.

Мужчыны, сумеўшыся гэтага крыку, яшчэ раз азірнуліся. Кабета была нямая.

— Гэта мая залувіца, — прызналася маладая гаспадыня. — Сястра майго нябожчыка.

Нямая выглядала на адны гады з маладзіцаю, але, раскруціўшы і зняўшы з галавы хустку, выдалася старэйшаю.

— Нашто раздзяешся? — Маладзіца паказала на вядро, што стаяла на калодзе ў памялешніку. — Пара карову паіць.

Нямая паківала галавою, апранулася і, глянуўшы спадылба на чужых мужчын, выйшла з хаты.